# Школьная планета

**_НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!_**

**_№ 3 (59) ЛІСТАПАД 2019_**

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно” Мінскай вобласці*




*17 лістапада 2019 года адбыліся выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.*








*Вучням 9-х класаў пакуль яшчэ рана галасаваць, аднак яны праявілі актыўную грамадскую пазіцыю і сталі валанцёрамі на выбарчым участку ў нашай школе. Хлопцам і дзяўчатам спатрэбілася максімум такту, выхаванасці, ветлівасці і ўменне ўзаемадзейнічаць з незнаёмымі людзьмі. Справіліся яны на выдатна!*

# *Дом, у якім утульна ўсім!*

**berezino2.school.by** ***№ 3, лістапад 2019 г.***




Да драбніц была прадумана праграма мерапрыемстваў у дзень выбараў. Кожнаму, хто прыйшоў аддаць свой голас за выбранага кандыдата, прапаноўвалася шмат варыянтаў, каб правесці час цікава і насычана.

На школьнай сцэне перад гледачамі выступілі нашы вучні. У выкананні лепшых артыстаў установы прагучалі вершы і песні, прысвечаныя роднай зямлі.

Павысіць узровень камп’ютарнай граматнасці ўсе жадаючыя маглі ў рамках акцыі “З камп’ютарам на “ты””.

Лепшых гульцоў выбіралі на турнірах па шашках і настольнаму тэнісу.

Увазе наведвальнікаў былі прадстаўлены відэафільмы пра выпускнікоў нашай школы ў розныя гады навучання. Сярод тых, хто глядзеў на тэлеэкран многія з задавальненнем пазнавалі сябе і сваіх сяброў.

На першым паверсе працаваў міні-буфет, дзе можна было паспрабаваць прысмакаў на розны густ. Акрамя таго, праверыць ціск, дзеля чаго на ўчастку працавала медсястра ўстановы С.Ф.Каленціёнак







Акрамя таго, была наладжана выстава “Заўсёды з натхненнем”, на якой былі прадстаўлены драўляныя лыжкі, тканыя паясы, лялькі ў народных строях з калекцыі Г.А.Ждановіч, заснавальніцы пакоя-музея драўлянай лыжкі. Сярод тых, хто быў уражаны ўбачаным, дзеткі якія прыйшлі разам са сваімі бацькамі, а таксама замежныя госці – міжнародныя назіральнікі.

У цэлым, сіламі педагогаў і школьнікаў была створана добразычлівая атмасфера, дзе кожнаму наведвальніку было ўтульна.



**_Дом, у якім утульна ўсім!_**
**berezino2.school.by** ***№ 3, лістапад 2019 г.***

# Скажы наркотыкам "не"




***Лістапад у нашай школе быў абвешчаны месячнікам аховы здароўя, прафілактыкі алкагалізму, курэння, наркаманіі пад агульнай назвай "Мы выбіраем жыццё!". На другім паверсе ўстановы да ведама школьнікаў была прадстаўлена выстава "Скажы наркотыкам "НЕ"". Тут можна было атрымаць самую актуальную інфармацыю пра наркаманію, яе страшныя наступствы, пра людзей, якія становяцца ахвярамі наркотыкаў, пра неабходнасць захаваць сваё здароўе, катэгарычна адмовіцца ад прапановы паспрабаваць наркатычнае зелле.***

У апошнія гады ў свеце назіраецца хуткі рост распаўсюджанасці спажывання наркатычных сродкаў і іншых псіхаактыўных рэчываў як сярод дарослых, так і сярод падлеткаў. Гэта з'яўляецца сур'ёзнай пагрозай здароўю насельніцтва любой краіны, яе сацыяльнаму, эканамічнаму дабрабыту. «Хваробу лягчэй папярэдзіць, чым лячыць» – гэта залатое правіла медыцыны набывае асаблівае значэнне, калі гаворка заходзіць пра падлеткавую наркаманію.

Што ж такое наркаманія? Гэта захворванне, якое выяўляецца ў фізічнай і псіхічнай залежнасці ад наркотыкаў, непераадольнай цязе да іх, што паступова прыводзіць арганізм да фізічнага і псіхічнага знясілення.

Як правіла, асноўныя прычыны далучэння да наркотыкаў носяць сацыяльны характар. Часцей за ўсё падлетак падпарадкоўваецца ціску асяроддзя, спрабуючы наркотык не дзеля атрымання эйфарычнага стану, пра які ён яшчэ мае самае прыблізнае ўяўленне, а дзеля цікавасці, каб стаць «сваім» у кампаніі, не «быць белай варонай», «зняць напружанне пры зносінах з малазнаёмымі людзьмі». Сярэдняя працягласць жыцця актыўнага наркамана складае 3 гады. Дзеці, народжаныя ад наркаманаў, паміраюць вельмі хутка, дажываючы максімум да 4 месяцаў. Наркотык губіць нашу будучыню.Па сутнасці, наркотыкі з'яўляюцца атрутай. Эфект залежыць ад колькасці, якая прынята.



Невялікая колькасць аказвае стымулюючае ўздзеянне (павышэнне актыўнасці).

Наркотык ў большай колькасці дзейнічае як седатыўны сродак (падаўленне актыўнасці).

У яшчэ большай колькасці - дзейнічае як атрута і можа прывесці да смяротнага зыходу.

Гэта праўдзіва ў стаўленні да любога наркотыку. Адрозніваецца толькі колькасць, якая патрабуецца для дасягнення якога-небудзь эфекту.

Але шматлікія наркотыкі валодаюць яшчэ адным пабочным дзеяннем: яны ўздзейнічаюць непасрэдна на розум, могуць парушыць адэкватнасць успрымання навакольнага свету чалавекам, які знаходзіцца пад наркатычным уздзеяннем. У выніку дзеяння чалавека становяцца дзіўнымі, нерацыянальнымі і нават разбуральнымі.

Наркотыкі блакуюць усе адчуванні. Так яны аказваюць часовае палягчэнне болю і пакут, аднак наркотыкі таксама зніжаюць здольнасці чалавека, пільнасць. Доўгае па тэрмінах ужыванне наркотыкаў пазбаўляе жыццё задавальненняў і радасці, якія, уласна, і з'яўляюцца прычынай для таго, каб жыць. У выніку чалавек аказваецца перад выбарам: наркотыкі і смерць або жыццё без наркотыкаў.

Жыць і сталець у нашым свеце бывае цяжка. Але на самай справе, звычайныя, на першы погляд, рэчы могуць рабіць цуды. Напрыклад, правільнае харчаванне і нават проста доўгія прагулкі, у час якіх трэба глядзець на навакольныя прадметы, пакуль увагу не пераключыцца на знешні свет і не знікне напружанне. Абмеркаванне праблем з сябрам, святаром або з блізкім сваяком таксама можа дапамагчы.

*Дом, у якім утульна ўсім!*
**berezino2.school.by** **№ 3, лістапад 2019 г.**

# Мельхіёр Ванькoвіч - чалавек, асоба, творца

Аб’яўленне 2018-2020 гг. Гадамі малой радзімы паспрыяла абуджэнню зацікаўленасці шматлікіх людзей, у тым ліку і нас, прадстаўнікоў маладога пакалення, да гісторыі роднага краю. Даведацца нешта новае, раскрыць раней невядомыя факты стала першаснай мэтай нашых краязнаўчых пошукаў.

Нам не раз даводзілася чуць, што за кожнай канкрэтнай справай стаіць канкрэтны чалавек, які разважае, марыць, рэалізоўвае задуманае, ажыццяўляе ўласныя праекты, не стамляецца працаваць, займацца творчасцю. Сярод тых людзей, якія сваімі карыснымі справамі і годнымі ўчынкамі ўславілі малую радзіму, Мельхіёр Ванькoвіч, імя якога вядома вузкаму колу краязнаўцаў, навуковым даследчыкам польскай літаратуры. Больш вядомае імя другога прадстаўніка роду Ванькoвічаў, чый лёс быў звязаны з нашым краем, Валенція Вільгельма Ванькoвіча, знакамітага мастака, які атрымаў еўрапейскае прызнанне, быў добра знаёмы са славутымі дзеячамі свайго часу і напісаў іх партрэты.



Мельхіёр Ванькoвіч — польскі пісьменнік беларускага паходжання, публіцыст, рэпарцёр, грамадскі дзеяч. Ён даўно займеў прызнанне ў Польшчы. Дзякуючы яго літаратурнаму таленту, неўтаймаванай энергіі, творчаму запалу і складанай пісьменніцкай працы, польская літаратура ўзбагацілася не адным дзясяткам твораў. Яны, гэтыя творы, сталі люстэркам часу, своеасаблівай крыніцай ведаў па гісторыі і культуры.

Мельхіёр Ванькoвіч нарадзіўся 10 студзеня 1892 г. у радавым маёнтку **вёсцы Калюжыца Ігуменскага павета (цяпер Бярэзінскі раён),** дзе правёў свае дзіцячыя і юнацкія гады. Пазней пісьменнік узгадае гэты час у сваёй **кнізе “Шчанячыя гады”** (у перакладзе на беларускую мову твор з’явіўся ў 2012 г.).

Жыццё М.Ванькoвіча было багатым на падзеі. Вядома ж, ён шмат вучыўся, займаўся пісьменніцкай працай. Аднак галоўнае, што нам удалося зразумець, вывучаючы біяграфію пісьменніка, М.Ванькoвіч быў сапраўдным, шчырым патрыётам, ён быў гатовы абараняць сваю радзіму цаной жыцця і заўсёды імкнуўся заставацца прынцыповым. І гэта невыпадкова. Яго бацька Мельхіёр, у гонар якога назвалі будучага пісьменніка, удзельнік паўстання 1863 г., быў арыштаваны і сасланы ў Сібір. Сам пісьменнік змагаўся з гітлераўцамі і прыняў удзел у бітве пад Монтэ-Касіна ў Італіі, быў узнагароджаны, пазней напісаў кнігу пра гэтыя падзеі. Дарэчы, дачка польскага празаіка Крысціна змагалася з фашыстамі і загінула.

У 1964 г. Ванькoвіч звярнуўся да ўладаў Польскай Народнай Рэспублікі з рэзкай крытыкай культурнай палітыкі краіны. Адбылася траўля пісьменніка, цудам ён пазбег 3 -гадовага пакарання, але 5 тыдняў правёў у турме.

Творы М.Ванькoвіча заўсёды былі злабадзённыя, ён востра адчуваў час і адлюстроўваў яго на старонках сваіх твораў. Ён быў цудоўным апавядальнікам, яго проза шмат насычана анекдотамі, лірычнымі адступленнямі і прамымі зваротамі да чытача-слухача. Так, аўтар пісаў па-польску, шмат зрабіў для Польшчы, аднак ён ніколі не забываў пра свае карані, вытокі, зямлю сваіх бацькоў.

У гонар Мельхіёра Ванькoвіча названа адна з вуліц Варшавы, усталявана шыльда на доме, дзе жыў пісьменнік, праводзяцца творчыя конкурсы. Яго імя носіць польская школа ў Йерцы. У горадзе Піш усталяваны помнік пісьменніку і яго кнізе “На тропах Сментка”. Магчыма, і ў нас на малой радзіме пісьменніка яго імя будзе належным чынам ушанавана.

Зараз жа ўсе мы маем цудоўную магчымасць пазнаёміцца з невялікім фрагментам кнігі “Шчанячыя гады” М.Ванькoвіча, якая не пакіне вас раўнадушным. З гумарам, добрай іроніяй, а часам вельмі пранікнёна, шчыра аўтар раскрывае нам свет мінулага, якога даўно няма, але ён поўніцца дзівосамі, загадкамі, чалавечымі марамі і пачуццямі, любоўю да сваёй радзімы.




*Заклікаюць чытаць*
*Бурая Анастасія і Морская Яна*

Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by № 3, лістапад 2019 г.




# Рух алімпійскі

# Лепшыя з лепшых:

## пераможцы і прызёры 2 этапа рэспубліканскай прадметнай аліміпіяды

Калі гаварыць строгай мовай лічбаў, то вынікам удзелу ў алімпіядзе ў гэтым навучальным годзе сталі 29 месцаў: 1-х месцаў - 8, 2-х месцаў - 8, 3-х месцаў - 13 (для параўнання ў мінулым навучальным 2018/2019 годзе былі заваёваны 20 месцаў: 1-х месцаў - 9, 2-х месцаў - 8, 3-х месцаў - 3, 16 дыпломаў). Пасяховасць удзелу навучэнцаў установы адукацыі ў другім этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах склала 54%. Па выніках другога этапа ўпраўленне па адукацыі, спорту і турызму Бярэзінскага райвыканкама прысудзіла 23 (7/6/10) дыпломы, бо дзецям, якія маюць прызавое месца, але невысокі працэнт выканання задання, дыплом не выдаваўся.



У другім этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах 7 навучэнцаў прынялі ўдзел па двух прадметах, 3 навучэнцы па трох прадметах. 1 удзельнік другога этапа алімпіяды ўзнагароджаны дыпломамі па трох прадметах, 4 навучэнцы - па двух прадметах. Губчэўская Кацярына прыняла ўдзел у трох алімпіядах па вучэбных прадметах у другім этапе і атрымала дыплом першай ступені па беларускай мове, дыплом II ступені па матэматыцы і дыплом III ступені па фізіцы; Лапцёнак Вікторыя - дыплом I ступені па гісторыі і рускай мове; Лапцёнак Марына - дыплом III ступені па матэматыцы і дыплом I ступені па беларускай мове; Наумава Аляксандра - дыплом II ступені па грамадазнаўству і дыплом III ступені па гісторыі; Радзевіч Руфіна - дыплом II ступені па грамадазнаўству і дыплом III ступені па геаграфіі. Установа адукацыі заняло другое месца ў раёне па колькасці дыпломаў, прапусціўшы наперад Бярэзінскую гімназію.

# Віншуем!

## У трэцім этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах заслужылі права прадставіць Бярэзінскі раён

**па вучэбным прадмеце "Руская мова" - вучаніца 10 класа Лапцёнак Марына, настаўнік Абрамовіч Святлана Віктараўна**

**па вучэбным прадмеце «Геаграфія» вучаніца 11 класа Кузіна Паліна, настаўнік Макарэвіч Людміла Мефодзьеўна**

**па вучэбным прадмеце "Руская мова" вучаніца 11 класа Лапцёнак Вікторыя, настаўнік Бярнацкая Ніна Васільеўна**

# Жадаем поспехаў і перамог!

# "У нас у гасцях"

**Сустрэча з цікавым чалавекам – гэта сапраўдны падарунак, свята, таму што ты ўзбагачаешся новымі ведамі, уражаннямі, адкрыццямі і проста атрымоўваеш добры настрой. Вучням пачатковых класаў у гэтым сэнсе пашанцавала: для іх была наладжана сустрэча з мясцовым пісьменнікам і мастаком Уладзімірам Паўлавічам Несцяровічам. Гэта невыпадкова. Зараз пад кіраўніцтвам настаўніцы Т.М.Фядотавай яе вучань рыхтуе даследчую працу па літаратурных творах нашага земляка, вынікі якой будуць прадстаўлены ў час правядзення адкрытага фестывалю “Я – даследчык”.**

У госці да школьнікаў завітаў чалавек, якога чакалі з непадробнай цікавасцю і задавальненнем. Карціны Уладзіміра Несцяровіча прадстаўлены на трэцім паверсе нашай школы. Вядома, кожны іх бачыў не раз і добра ведае.

Уладзіміра Паўлавіча прырода ўзнагародзіла рознымі талентамі. Яго майстэрству, фантазіі падуладна ўсё: звычайным кішэнным сцізорыкам ён можа выразаць шахматныя фігуры, а пэндзлем стварыць партрэт, нацюрморт. Аднак большасць яго мастацкіх прац – гэта пейзажы, якія прысвечаны яго малой радзіме вёскі Карбаўское Бярэзінскага раёна, якая натхняе і ўзбагачае мастака, дае сілы для працы, уважлівага роздуму, назірання.

Яго талент невычарпальны, а душа прагне расказаць пра сваё замілаванне прыродай малой радзімы праз радкі вершаваных і празаічных твораў.



Невыпадкова ж, ён звыш дваццаці гадоў жыцця аддаў працы ў рэдакцыі раённай газеты «Сцяг Леніна» (“Бярэзінская панарама”), дзе прайшоў шлях ад фотакарэспандэнта да загадчыка аддзела сельскай гаспадаркі.

Кожны, хто меў магчымасць сустрэцца з Уладзімірам Паўлавічам, пагутарыць з ім, задаць свае пытанні, убачыць яго карціны і прачытаць творы, змог пераканацца ў тым, які гэта цікавы чалавек, таленавіты, творча адораны. Між іншым, двое вучняў разам з настаўніцай змаглі пабываць на Любушаншчыне і ўбачыць на ўласныя вочы мясціны, якія апеў пісьменнік у сваіх творах.



*Даведалася пра цікавага чалавека*
*Бурая Анастасія*

## Увага! Конкурс!

*Шаноўныя чытачы нашай газеты!*

**Мы аб’яўляем творчы конкурс, прысвечаны зіме.**

Спадзяемся, гэта пара года, а таксама святочны перадднавагодні настрой натхніць вас на стварэнне вершаваных ці празаічных твораў, малюнкаў ці фотаздымкаў, вырабаў з прыродных матэрыялаў.

**Чакаем вашы працы** ў кабінеце намесніка дырэктара Бародзіч І.М.

Лепшыя творы будуць апублікаваны на старонках нашай газеты.

Зробім яе па-навагодняму святочнай і прыгожай!

*Дом, у якім утульна ўсім!*
berezino2.school.by *№ 3, лістапад 2019 г.*

# У полі зроку: ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

Выбраць сваю будучую прафесію - гэта значыць зрабіць важны крок у сваім жыцці. Хочацца, каб праца ўсё жыццё прыносіла задавальненне як маральнае, так і матэрыяльнае, каб не расчаравацца, што дарэмна правёў гады навучання прафесіі нецікавай і непатрэбнай. Станоўчыя эмоцыі ад працы, якой будзеш займацца, і добры заробак - вось урэшце тое, што хацелася б атрымаць.

Як выбраць прафесію, каб не зрабіць памылку? Можна прыслухацца да парад бацькоў, педагогаў, сяброў. Таксама добра было б звярнуцца на кансультацыю да спецыяліста і зрабіць неабходную дыягностыку, якая падкажа да якой прафесіі вы схільныя. Дапаможа ў гэтым псіхолаг нашай установы Алена Юр’еўна Кузіна.





Акрамя таго, у нашай школе праводзяцца прафарыентацыйцныя сустрэчы. З пачаткам навучальнага года да нас завіталі прадстаўнікі Беларускага аграрна-тэхнічнага ўніверсітэта, Магілёўскага інстытута Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Ваеннай акадэміі Рэсублікі Беларусь. У час такіх сустрэч можна пачуць аб перспектывах навучання ва ўстанове, задаць пытанні, атрымаць індывідуальную кансультацыю. Спецыяльна для будучых выпускнікоў нашы госці, будучыя праваахоўнікі, падрыхтавалі канцэрт і прадэманстравалі сваё творчыя здольнасці.





## ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ?

**Праверце свае веды і адкажыце на пытанні віктарыны.**
**Правільныя адказы чытайце на старонцы нашай газеты.**

1. Прадстаўнікі гэтай прафесіі ў мінулым уваходзілі ў лік самых давераных асоб розных кіраўнікоў. Напрыклад, у французскіх летапісах імя гэтага прыдворнага спецыяліста ішло адразу пасля імені караля. Назавіце гэтую прафесію?
2. Старажытныя грэкі малявалі багіню Гігею ў выглядзе маладой жанчыны, якая корміць змяю з сасуда. Сёння «сасуд Гігеі» з'яўляецца сімвалам адной з абласцей навуковай і практычнай дзейнасці чалавека. Якой?
3. Назва гэтай прафесіі ўтворана двума старажытнагрэцкімі словамі, якія літаральна азначаюць «праца рукамі». Як называецца гэтая прафесія?

Правільныя адказы: 1.Повар 2. Медыцыны 3. Хірург

*Дом, у якім утульна ўсім!*
berezino2.school.by № 3, лістапад 2019 г.

## "Радуга" запрашае

У лістападзе ў час асенніх канікул для ўсіх жадаючых была магчымасць правесці час у аздараўленчым лагеры "Радуга".




У гэтым навучальным годзе хлопчыкам і дзяўчынкам было прапанавана займальнае падарожжа ў свет прафесій.




Выхаванцы падрабязней даведаліся пра спецыфіку дзейнасці медыкаў, ваенных, будаўнікоў. Пазнаёміліся яны і з працай журналіста. Рэдактар школьнай газеты А.Я.Ждановіч расказала ім пра школьную газету, пра яе рубрыкі і этапы стварэння.






Між іншым, у кастрычніку 2019 г. стала вядома, што па выніках **абласнога этапа рэспубліканскага агляду-конкурсу на лепшы аздараўленчы лагер АЛ "Радуга"** нашай установы адукацыі заняў **ганаровае другое месца** ў намінацыі "Новыя мадэлі арганізацыі дзіцячага адпачынку "Зробім лета ярчэй"". **Віншуем і жадаем далейшай плённай працы!**



| | | |
|---|---|---|
| ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино» | ДУА "Сярэдняя школа №2 г. Беразіно" 223311 вул. Мультана, 19 Электронная пошта berezinosch2.edu@tut.by<br><br>Сайт школы berezino2.school.by | Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц. Над выпускам працавалі ўдзельнікі клуба "Юны журналіст": Бурая Анастасія, Губчэўская Кацярына, Лукашэвіч-Рыбачонак Лізавета, Морская Яна, Рафальская Аляксандра, Радзевіч Аліна і інш. |